зафиксированы в интерьере мечети. Вокруг полосы с надписью размещались трехрядные майоликовые бордюры. Щековые стены, софиты центральной арки и тимпан украшали восьмигранные майоликовые плиты с геометрическим орнаментом, поверх глазури (белого, голубого, синего или фиолетового цвета) были нанесены пятна позолоты. Архивольт арки опирался на трехчетвертные колонки с причудливыми капителями, украшенными геометрическим и растительным орнаментами. Стены вестибюля были покрыты росписью, выполненной черной и синей краской (фрагменты обнаружены во время исследований) [4, с. 100]. Этот своеобразный музей восточного зодчества привлекает паломников и туристов со всего света. Любопытно, что первым европейцем, увидевшим и описавшим комплекс Султан-Саодат, был посетивший его в 1880 году известный французский путешественник, географ и этнограф Габриэль Бонвало [6, с. 18].

В советское время весь прилегающий к границе район Термеза был закрыт для туристов. И лишь после обретения Узбекистаном независимости путешественникам, преодолевшим немалые расстояния, стали доступны эти уникальные памятники Термеза.


1. Бабаджанов, Б. Садат-и Тирмиз / Б. Бабаджанов // Ислам на территории бывшей Российской империи. – Вып. 3. – М., 2001. – С. 89–92.
2. Мирзаев, Дж.З. Роль термезских саййидов в истории Центральной Азии / Дж. З. Мирзаев // O'zbekiston tarixi.– 2004. – №3. – С.13–23.
3. Мирзаев, Дж. К биографии художника Мир Саййида Али Термизи / Дж. Мирзаев // Камолиддин Беҳзоднинг жаҳон маданияти тарихида тутган ўрни. Буюк рассом таваллудининг 550 йиллигига бағишланган илмий анжуман материаллари. – Тошкент, 2005. – С.121–123.
4. Некрасова, Е. Г. Султан+садат / Е. Г. Некрасова, Б. М. Бабаджанов // Ислам на территории бывшей Российской империи: Энциклопедический словарь. – Вып. 3. – М., 2001. – С. 98–100.
5. Семенов, А.А. Происхождение термезских сейидов, и их древняя усыпальница «Султан Садат» / А. А. Семенов // Протоколы Туркестанского кружка любителей археологии. Год XVII/(XIX). –Т., 1914. – С. 10.
6. Mirzaev, Ds. Sultan Saodat – hier ruhen die "Herrscher der Glücklichen" / Ds. Mirzaev. – "Wostok"2010. Surchandarja.Über die jahrtausende Schmelztiegel der Kulturen im südlichen Usbekistan. –S. 18–19.



**Мясаедава С.Н.**


## ПРА ЦМОКАЎ І "ЦМОКАЎ", АБО ЯК СТВАРАЮЦЦА БРЭНДЫ


*Ключавыя словы:* Сянно, міфалогія, Караткевіч, цмокі, баскетбол.


**"Азёрная краіна".** На паўднёвым захадзе Віцебскай вобласці ў Сенненскім раёне "сустракаюцца ў вялікай колькасці азёры рознага памеру". Яны большай часткай групуюцца ў доўгія ланцугі, злучаюцца паміж сабою пратокамі і ручаямі, верагодна з'яўляюцца рэшткамі рэк пасляледніковага перыяду. Яшчэ на пачатку XX ст. у Сенненскім павеце іх налічвалася больш за 100, многія месціліся на паўночным захадзе ад горада Сянно такім чынам, што гэты край нагадваў па трапнаму выразу этнографа і краязнаўцы Кірыла Цімафеевіча Анікіевіча "азёрную краіну" [1] (калі ўлічваць той факт, што на тэрыторыі Магілёўскай губерні, у склад якой уваходзіў Сенненскі павет, увогуле азёр было мала).

Азёры, здаецца, нічым не адметныя, тапаграфічна аднолькавая. Яны знаходзяцца на плоскім узвышшы паміж Дняпром і Заходняй Дзвіной, большасцю маюць цвёрдыя берагі, парослыя трыснягом ці чаротам; перасякаюцца балоцістымі лясамі або чыстымі балотамі. Глыбіня азёр месцамі значная; дно ў асноўным пясчанае [3].

Возера Сянно знаходзіцца ў басейне ракі Крывінкі на поўнач ад горада і звязана маленькай рачулкай з Багданаўскім возерам, якое праз рэчку ў мястэчку Бешанковічы злучаецца з Заходняй Дзвіной [4]. Паўднёвая частка возера глыбакаводная (найбольшая глыбіня – 31,5 м), паўночная – мелкаводная. У яго ўпадаюць каля 20 ручаёў [2]

Звычайна вакол азёр складаюцца легенды і паданні, але, як ні дзіўна, пра сенненскія такіх гісторый вельмі мала [11] і гісторыкі, краязнаўцы могуць запоўніць гэтую лакуну самастойна і ў будучым ствараць свае брэнды.

**Цмокі.** Азёры, напрыклад, можна засяліць цмокамі (драконамі), пачварамі з высокім інтэлектам і, пажадана, прыязнымі ў адносінах да людзей тым больш, што зараз назіраецца нейкі "драконавы бум". Так, дзякуючы ініцыятыве лепельскага краязнаўцы Уладзіміра Шушкевіча на беразе возера Лепельскае ў 2013 г. з'явілася скульптура міфічнай змеепадобнай істоты, Цмока Лепельскага, персанажа з міфалогіі Вялікага Княства Літоўскага і пачвары, якая нібыта жыве ў возеры. За аснову прынялі паданне пра цмокаў, якое прапанаваў Уладзімір Караткевіч у рамане "Хрыстос прызямліўся ў Гародні". З таго часу прайшло 10 гадоў. Цмок пераўтварыўся ў сапраўдны брэнд краю.

Але Уладзімір Караткевіч пісаў не толькі пра Лепель, але і пра Сянно, і ў 2017г. "цмок прызямліўся ў Сянне": намаганнямі дырэктара Сенненскай школы-інтэрната Леаніда Казлова ў этнаграфічным пакоі з'явілася выява гэтай міфалагічнай істоты [12].

Згодна Ул. Караткевічу, цмокі сустракаліся раней паўсюдна, асабліва ў сенненскіх азёрах, былі сярод іх і небяспечныя. Прападобны Амбражэй Куцеянскі (верагодна з Аршанскага Свята-Багаяўленскага Куцеінскага манастыра – *С.М.*) калісьці закляў і загнаў іх у возера (нейкае адно, але яны маглі неўзабаве і рассяліцца, азёры ж спалучаюцца – *С. М.*). Таму сенненскія цмокі нікога не хапалі і не лапалі, людзей не палохалі, верагодна, жылі сабе пад вадой, а калі і выходзілі, то ноччу. Па меркаванню Ул. Караткевіча цвярозы чалавек не палезе ўначы ў возера, таму і ўбачыць сенненскіх цмокаў "акрамя п'янюг начных" ніхто не мог [10].

Да гэтага можна ўспомніць вядомыя легенды пра возера Сянно, з якіх мы выдзяляем наступныя міфалагемы:

– добры дух перамог злога ("чудзілу з вялікай галавой"), і апошні помсціць, кожны год забірае чалавека;

– паміж добрым духам возера і людзьмі было пагадненне, што яны даюць яму нейкае дабро, а ён, у сваю чаргу, аберагае іх, дапамагае з рыбай. Як толькі пагадненне людзі парушылі, добры дух узлаваўся;

– астравы з'яўляюцца месцамі пражывання духаў;

– добрая прыкмета – спакойнае возера ў час, калі дзіця нараджаецца [4].

Згодна дадзеным міфалагемам можна дапусціць, што пад паняццем "духі" аўтары паданняў маглі разумець якраз цмокаў.

Лепельскі цмок з'явіўся пры трагічных абставінах: у тым годзе, калі загінула мноства жывых істот, з іх сорак адзін лепельскі цмок, пачвары ўсплылі на паверхню, іх убачылі і апісалі [10].

Сенненскія цмокі ў тым годзе людзям не паказаліся. Яны маглі, канешне, выглядаць як "чудзілы з вялікай галавой" [4] ці быць падобнымі на лепельскіх. А можа быць сенненскі цмок – гэта вясёлка над возерам, якая быццам высмоктвае ваду з яго (цмок смокча) і вяртае назад на неба. Апошні выгляд цмока, дарэчы, не супадае з бачаннем Ул. Караткевіча.

**“Цмокі”.** Увогуле, на тэму дракона-цмока, яго характара і выгляда можна фантазіраваць бясконца. Беларускі баскетбольны клуб “Мінск”, напрыклад, у 2012–2022 гг. называўся “Цмокі-Мінск”, палічыўшы выдатнай метафарай выхад на пляцоўку “з агнём у душы”, адпаведна меў паступова дзве выявы цмока на эмблеме (2014–2017 гг., 2019–2022 гг.), зусім непадобнага на лепельскага.

Дарэчы, сапраўдная гісторыя пра з’яўленне баскетбола на Беларусі якраз тычыцца Сянно. Каротка яе можна ўпісаць у тэзіс: “Сянно – радзіма беларускага баскетбола”, і гэта ўжо не фантазія пісьменніка, а звесткі з дакументаў 1919 – пачатку 1920-х гг.



**Сянно – радзіма беларускага баскетбола.** Спартыўны клуб у Сянне адчыніўся 8–9 мая 1919 г. у быўшым доме Шыбекі на вуліцы Карла Маркса з вялікім кавалкам зямлі і садам. Дзякуючы намаганням першых інструктараў па фізічнай культуры і спорце аддзела Ўсеагульнага воінскага навучання Сенненскага павятовага ваенкамата тут культывавалі з мая да верасня 1919 г. многія віды спорту. У прыватнасці летам 1919 г. пад кіраўніцтвам семнаццацігадовага Станіслава Уладзіміравіча Янаніса [5] займаліся гімнастыкай, лёгкай атлетыкай, барацьбой [6], па вечарах гулялі лаўн-тэніс, кракет, серсо, лапту, баскетбол [9].

Баскетбол быў параўнальна новым відам спорту ў РСФСР, у склад якой уваходзіў і Сенненскі павет Віцебскай губерні, і ўпершыню ў губерні яго пачалі гуляць менавіта ў Сянне ў 1919 г. У 1922 г. аддзел Усеагульнага воінскага навучання Сенненскага павятовага ваеннага камісарыяту ў план работы па спорту і фізічнай культуры на вясенні і летні перыяды 1922 г. уключыў развіццё лёгкай і цяжкай атлетыкі, бокса, гімнастыкі, спартыўных гульняў, рамонт байдаркі і будаўніцтва новых лодак, устаноўку на гарадской пляцоўцы прыстасаванняў для лаўн-теніса, баскетбола, кракета, кегельбана. Баскетбол уключылі ў праграму заняткаў па спорце і фізічным развіцці на летні перыяд 1922г. з моладдзю 1902, 1903, 1904, 1905 гг. нараджэння, планавалі 36 гадзін вывучаць гісторыю гульні, правілы, пляцоўку, а таксама правесці трэніроўкі і да 15 чэрвеня 1922 г. сфарміраваць каманду [8, арк. 70, 72–72адв., 97–98адв., 199, 200–200адв.]. Такім чынам, першая вядомая сёння секцыя па баскетболе была аформлена ў фізкультурным цэнтры Сенненскага павета ў 1922 г. [13], на 1ліпеня 1922 г. у яе ўваходзіла 12 чалавек, на 10 кастрычніка 1922 г. – 18 чалавек [7, арк. 44, 64; 8, арк. 247, 248]. А паколькі звестак аб развіцці баскетбола ў іншых рэгіёнах сучаснай Беларусі да 1922 г. пакуль не выяўлена, Сянно можна лічыць радзімай беларускага баскетбола.

Такім чынам, і цмокі, і баскетбол могуць стаць у тым ліку брэндамі рэгіёна як, напрыклад, “Двукоссе”. И на беразе возера сярод іншага можна расказваць легенды пра цмокаў і вясёлку на небе ці гісторыю пра Сянно – радзіму беларусскага баскетбола.

Нейрасетка Kandinsky 2.1 згенеравала прыкладную выяву (адну з вялікай колькасці магчымых) па запыту “возера, цмок, баскетбол і вясёлка”.


1. Аникиевич, К. Т. Сенненский уезд Могилёвской губернии : опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях, с картою уезда, схемою двух озер и рисунками в тексте / К. Т. Аникевич. – Могилёв : Могилёвский губ. стат. ком., 1907. – С.25.
2. Бандарэвіч, В. В. Экскурсія да вытокаў горада Сянно : краязнаўчыя нарысы / В. В. Бандарэвіч. – Мінск: Литература и Искусство, 2008. – С. 16.
3. Военно-статистическое обозрение Российской Империи // издаваемое по Высочайшему повелению при 1-м отделении Департамента Генерального Штаба. – Санкт-Петербург : в типографии Департамента Генерального Штаба , 1848–1858 . – Т. 8, ч. 3: Могилевская губерния / [по рекогносцировкам и материалам, собранным на месте, составлял Ген. штаба кап. Черницкий]. – 1848. – [3], 79, 61 с., [3] л. табл. – На шмуцтит. загл.: Военно-статистическое обозрение Могилевской губерниі. – С. 34.
4. Вялішчанскі, С. Сенненскае возера / С.Вялішчанскі // Наш край. – 1927. – № 1. – С. 55–58.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1582. Воп. 1. Спр. 157. Арк. 56.
6. ДАВВ. – Ф. 1582. Воп. 1. Спр. 352. Арк. 16 – 16адв.
7. ДАВВ. – Ф. 1582. Воп. 1. Спр. 547.
8. ДАВВ. – Ф. 1582. Воп. 1. Спр. 558.
9. Занальны Дзяржаўны архіў у г. Оршы. – Ф. 1396. Воп. 1. Спр. 475. Арк. 246 – 246адв., 346.
10. Караткевіч, Ул. Хрыстос прызямліўся ў Гародні [Электронны рэсурс] / Ул. Караткевіч // Беларуская палічка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Uladzimir_Karatkievic/Chrystos_pryziamliusia_u_Harodni.html. – Дата доступу: 19.09.2023.
11. Кулікоўскае // Азёры Беларусі ў легендах і паданнях / склад., запіс, апрац. А. М. Ненадаўца. – Мінск.,2003. – С. 88–90.
12. Цмок прызямліўся ў Сянне [Электронны рэсурс] // Сайт газеты “Голас Сенненшчыны” – Рэжым доступу: https://www.senno.by/?p=28775. – Дата доступу: 19.09.2023.
13. 100 лет первой секции по баскетболу [Электронны рэсурс] // Сайт Белорусской федерации баскетбола. – Рэжым доступу: https://belarus.basketball/novosti/raznoe/6997-100-let-pervoj-sektsii-po-basketbolu. – Дата доступу: 01.07.2022.